***С. В. Зыгмантовіч,***
*кандыдат педагагічных навук*

# ФАРМІРАВАННЕ ГАТОЎНАСЦІ ДА ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У ПРАЦЭСЕ НАВУЧАННЯ

Сучасны этап развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі звязаны з перыядам рэфармавання, у ходзе якога трансфармуюцца прынцыпы яе пабудовы, аднаўляюцца сама мадэль адукацыі, змест дзейнасці вышэйшых адукацыйных устаноў. У сітуацыі пошуку каштоўнасных падстаў новай педагагічнай парадыгмы важнай задачай адукацыйнай палітыкі з’яўляецца павышэнне якасці прафесійнай адукацыі на аснове захавання фундаментальнасці, адпаведнасці патрэбнасцям грамадства, дзяржавы, запытам асобы і інш. Дадзеныя тэндэнцыі актуалізуюць неабходнасць асэнсавання кірункаў удасканалення падрыхтоўкі спецыялістаў, у тым ліку і для бібліятэчнай сферы.

Грамадства чакае прафесіянала бібліятэчнай сферы з высокім узроўнем не толькі інфармацыйнай, тэхналагічнай, тэхнічнай падрыхтоўкі, але і педагагічнай. У новых сацыяльна-культурных умовах праца бібліятэчнага спецыяліста ўсё больш напаўняецца псіхолага-педагагічным сэнсам і зместам.

Аб’ектыўная неабходнасць якаснай педагагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў бібліятэчнай сферы абумоўлена сучаснымі выклікамі грамадства, спецыфікай культурна-гістарычных асаблівасцей развіцця бібліятэк, сучаснымі сацыяльна-палітычнымі перадумовамі ў кантэксце каштоўнасна-мэтавых прыярытэтаў дзяржаўнай сацыяльнай палітыкі, дзе асаблівая ўвага факусіруецца на рабоце бібліятэк як сацыяльнага інстытута, жыццёва важнага кампанента навукі, культуры, адукацыі; інстытута, які забяспечвае прадастаўленне доступу да культурнай і навуковай спадчыны; садзейнічае развіццю ведаў, дэмакратычнага працэсу, пераадоленню лічбавай няроўнасці, фарміраванню духоўна багатай, маральна здаровай асобы грамадства.

Названыя абставіны абумоўліваюць неабходнасць пераасэнсавання зместу дзейнасці сучаснага бібліятэчнага спецыяліста з улікам сённяшніх сацыякультурных рэалій, адпаведна і пытанняў фарміравання гатоўнасці бібліятэчных спецыялістаў да педагагічнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз філасофскай і псіхолага-педагагічнай літаратуры паказаў, што існуе значная колькасць дэфініцый паняцця «гатоўнасць». Яно разглядаецца як складанае ўтварэнне, якое ўключае ў сябе кагнітыўны (змястоўны), матывацыйны, эмацыянальна-валявы кампаненты, а таксама сукупнасць прафесійных ведаў і ўменняў (Л. І. Дзяменцій, В. А. Сласцёнін); як наяўнасць пэўных здольнасцей (Б.Г. Ананьеў); як асобаснае ўтварэнне, складнікамі якога з'яўляюцца прафесійныя якасці, уменні і псіхічны стан (М. І. Дзьячэнка, Л. А. Кандыбовіч); як кампанент адпаведнасці чалавека прафесійнай дзейнасці (І. А. Зімняя, Н. В. Маёрава).

Неадназначнасць тлумачэння тэрміна «гатоўнасць» да дзейнасці ў межах педагагічнай навукі абумоўлена наяўнасцю розных падыходаў да дадзенай праблемы: сістэмны, функцыянальны, асобасны.

Вывучаючы праблему фарміравання гатоўнасці будучых спецыялістаў, мы зыходзім з таго, што яе разгляд мэтазгодна ажыццяўляць і ў кантэксце кампетэнтнаснага падыходу, які якраз і накіраваны на фарміраванне «гатоўнасці навучэнцаў выкарыстоўваць засвоеныя веды, вучэбныя ўменні і навыкі, а таксама спосабы дзейнасці ў жыцці для вырашэння практычных і тэарэтычных задач» [1, с. 145].

Кампетэнтнасны падыход у дачыненні да падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў разглядаўся ў шматлікіх публікацыях [2]. Вышэйшыя навучальныя ўстановы культуры і мастацтваў, і ў прыватнасці Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, выконваюць заказ дзяржавы на падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў праз адукацыйныя стандарты, пабудаваныя на кампетэнтнаснай аснове, – вылучаюцца акадэмічныя, сацыяльна-асобасныя, прафесійныя кампетэнцыі [4].

Разам з тым ні ў дзяржаўным стандарце, ні ў спецыяльнай літаратуры не раскрываецца змест паняцця «педагагічная кампетэнтнасць бібліятэчнага спецыяліста». Пад зместам педагагічнай кампетэнтнасці бібліятэчнага спецыяліста мы прапануем разумець сукупнасць прафесійна важных тэарэтычных ведаў у сферы псіхалогіі і педагогікі, сфарміраванасць практычных уменняў і навыкаў, а таксама пэўны ўзровень развіцця прафесійна важных якасцей асобы, якія адлюстроўваюць гатоўнасць і здольнасць спецыяліста прымаць педагагічна ўзважаныя рашэнні ў рэальных умовах соцыуму, вырашаць з высокай эфектыўнасцю ўвесь комплекс псіхолага-педагагічных задач, якія ўзнікаюць у працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, даваць педагагічную ацэнку адбываючымся ў ёй працэсам.

Зыходзячы з дадзенага азначэння, можна вылучыць асноўныя кампаненты педагагічнай кампетэнтнасці асобы бібліятэчнага спецыяліста: матывацыйны, кагнітыўны, дзейнасны, асобасны, рэфлексіўны [3].

Параўнанне зместу разглядаемай кампетэнцыі з выкладзенымі ў Адукацыйным стандарце па падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў патрабаваннямі да прафесійных кампетэнцый у сферы педагагічнай дзейнасці сведчыць аб іх значным абмежаванні ў нарматыўным дакуменце, не прадугледжваюцца таксама магчымасці авалодання будучымі спецыялістамі ў поўным аб'ёме разнастайнымі відамі педагагічнай дзейнасці – псіхолага-педагагічнай, сацыяльна-педагагічнай, арганізацыйна-педагагічнай, карэкцыйна-педагагічнай, валеалагічнай, не раскрываецца кампанентны састаў кампетэнцыі.

Для вызначэння гатоўнасці да педагагічнай дзейнасці праведзена сацыялагічнае апытанне студэнтаў ФЗН. Апытаннем было ахоплена 90 чалавек. У ходзе даследавання высветлілася ступень асэнсаванасці студэнтамі прафесійнай педагагічнай падрыхтоўкі і іх гатоўнасці да гэтага віду дзейнасці. Вынікі даследавання дазваляюць сцвярджаць, што 86% студэнтаў-выпускнікоў задаволены атрыманай адукацыяй, 50% студэнтаў звязваюць сваю прафесійную дзейнасць у бібліятэцы з педагогікай, з некаторымі сумненнямі вызначае гэтую суаднесенасць 31%, адмоўны адказ атрыманы ад 16% рэспандэнтаў. Гэтыя даныя карэгіруюць і з адказамі на пытанне: «Ці асэнсоўвалі вы пры выбары прафесіі бібліятэкара-бібліёграфа яе педагагічную накіраванасць?» – 86% адказалі станоўча, 14% адказалі адмоўна.

На пытанне аб якасці педагагічнай падрыхтоўкі ў навучальнай установе былі атрыманы наступныя адказы: лічаць здавальняючай і дастатковай для педагагічнай дзейнасці ў бібліятэцы тую падрыхтоўку, якую яны атрымліваюць, – 81%; хутчэй нездавальняючай, чым здавальняючай, – 8%.

На пытанне аб тым, ці лічаць яны, што валодаюць асабістымі якасцямі для паспяховай педагагічнай дзейнасці ва ўмовах бібліятэкі, 34% адказалі адназначна і без сумненняў станоўча, 57% – хутчэй да, чым не; 7% – не валодаюць. Гэта яшчэ раз пацвярджае значымасць для студэнтаў і для бібліятэчных практыкаў мэтанакіраванай педагагічнай падрыхтоўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз адказаў на пытанне аб дысцыплінах, якія ў найбольшай ступені садзейнічалі фарміраванню ў іх педагагічных кампетэнцый, дазволіў ранжыраваць спецыяльныя дысцыпліны па іх значнасці ў разглядаемым кантэксце. Сярод іх як дысцыпліны псіхолага-педагагічнага, так і сацыяльна-гуманітарнага (сацыялогія, культуралогія) цыклаў, спецыяльныя дысцыпліны і дысцыпліны спецыялізацый.

Праведзены аналіз зместу педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў паказвае, што сярод найбольш прагрэсіўных тэндэнцый у вырашэнні праблемы ўдасканалення зместу прафесійнай адукацыі вылучаецца інтэграцыя педагагічных і бібліятэчна-бібліяграфічных ведаў, уменняў і навыкаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Інтэграцыя можа ажыццяўляцца ў розных формах:

– псіхолага-педагагічная падрыхтоўка з’яўляецца змястоўным ядром ведаў (педагогіка, псіхалогія і інш.);

– галоўным выступае бібліятэчна-педагагічны кампанент (абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк, псіхалогія кіравання, бібліятэчная педагогіка, бібліятэчная псіхалогія, фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў бібліятэк, дзіцячае чытачазнаўства і інш.);

– у змест часткова ўключаны элементы педагагічнай падрыхтоўкі (бібліяграфазнаўства: тэорыя і гісторыя; бібліятэказнаўства: тэорыя і гісторыя; каталагізацыя дакументаў; фонды бібліятэк і інш.).

Аналіз магчымасцей розных дысцыплін дазваляе зрабіць высновы аб неабходнасці ўдакладнення зместу кожнай дысцыпліны з пазіцый накіраванасці на фарміраванне педагагічнай кампетэнтнасці будучых бібліятэчных спецыялістаў; больш глыбокага вывучэння рэальнай, патэнцыяльнай і прагнастычнай псіхолага-педагагічнай інтэгратыўнасці вывучаемых дысцыплін; вызначэння мэты інтэграцыі як неабходнасці фарміравання прафесійнай накіраванасці, вопыту псіхолага-педагагічнай арыентацыі, якая забяспечвае гатоўнасць да бібліятэчна-педагагічнай дзейнасці як у тыповых сітуацыях, так і ў непрадбачаных.

Інтэграцыя псіхолага-педагагічных ведаў, уменняў і навыкаў у базавы кампанент прафесійнай бібліятэчна-бібліяграфічнай падрыхтоўкі будзе садзейнічаць павышэнню матывацыі студэнтаў і, як вынік, павышэнню якасці засваення вучэбнага матэрыялу, больш грунтоўнай падрыхтоўцы да выканання непасрэдных прафесійных задач.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Жук, О. Л.* Педагогическая подготовка студентов : компетентностный подход / О. Л. Жук. – Минск : РИВШ, 2009. – 335 с.

2. *Зыгмантовіч, С. В.* Прафесійная падрыхтоўка будучых бібліятэкараў : кампетэнтнасны падыход / С. В. Зыгмантовіч // Веснік БДУ культуры. – 2005. – № 2. – С. 101–107; *Елепов, Б. С.* Компетентность и компетенции библиотечного специалиста : как и зачем их оценивать / Б. С. Елепов, Е. М. Крючкова // Библиотековедение. – 2009. – № 3. – С. 115–134; *Яцевич, Н. А.* Компетентностный подход к подготовке специалистов по АБИС / Н.А. Яцевич. – URL: www.nbuv.gov.ua/articles /crimea/2007/174.pdf.

3. *Зыгмантовіч, С. В.* Педагагічная кампетэнтнасць спецыяліста бібліятэчнай сферы : змест і напрамкі фарміравання / С. В. Зыгмантовіч // Библиотеки и политика открытого доступа к информации и знаниям : материалы VII Междунар. книговед. чтений (Минск, 10–11 нояб. 2011 г.) / Национальная библиотека Беларуси ; сост. Л. Г. Кирюхина. – Минск, 2011. – С. 254–262.

4. *ОС РБ 1-23 01 11-2008.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць Е 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках). Кваліфікацыя – бібліятэкар-бібліёграф. – Узамен стандарта РД РБ 02100.5.211-98, уведз. 12.06.2008. – Мінск : Мін-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, 2008. – 38 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ